
Незалежнае выданьне Жодзіна й Смалявіцкага раёну

Жодзіна, сьнежань 2007


Прэс панарама № 7

Інфармацыйны агляд рэгіянальных і агульнанацыянальных падзеяў




Навіны, факты, камэнтары, карысныя парады: эканоміка, грамадзтва, права, зьмены заканадаўства, калектыўная абарона грамдзкіх інтарэсаў, правоў і свабодаў ...







Ó ÍÓ Ì ÀÐÛ:



Лапіцкаму А.І.

Лапіцкай С.П.

На Вашу заяву 10.12.2007 паведамляем, што навагодні ранішнік на беларускай мове для вучняў 5-7 класаў запланавана правесці ў гімназіі 29 снежня ў 12.30.

Чакаем прапаноў па дапамозе ў яго правядзенні.

Дырэктар
ДУА «Гімназія №1 г.Жодзіна» Г.В. Коршун





ЗАПРАШАЕМ НА ЕЛКУ !

БЕЛАРУСКАЯ ЕЛКА ЗНОЎ У ЖОДЗІНЕ





ЯНКА ЛАПІЦКІ,

ВУЧАНЬ БЕЛАРУСКАЕ КЛЯСЫ ЖОДЗІНСКАЙ ГІМНАЗЫІ №1

ЗДАРОЎЯ, ШЧАСЬЦЯ І ЛЮБОВІ, ПОСЬПЕХАЎ І – ПЕРАМОГІ ... У НОВЫМ 2008 ГОДЗЕ!!!



Ïðýñ ÏÀÍÀÐÀÌÀ



Цэнтар Ліцьвіны

E-mail: c_licviny@tut.by,
Сайт: www.licviny.INFO

ÍÀØÀ ÅËÊÀ...

“СЬВЯТА ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ БЕЛАРУСАЎ У ЖОДЗІНЕ — АДБУДЗЕЦЦА!”



ØÊÎËÀ

ТАК БЫЛО Ў 2005-06

Дзякуючы намаганьням актывістаў Жодзінскай ініцыятывы “ЗА ЭЎРАПЕЙСКІ ГОРАД” і ТБМ-аўскім ініцыятывам Рэгіянальнага аб’яднаньня грамадзянаў “ЗА ПЕРАМЕНЫ” пасьля трохгадовага перапынку …... – БЕЛАРУСКАЯ ЕЛКА ВЯРНУЛАСЯ Ў ЖОДЗІНА!

Фота: Аляксея Лапіцкага, Licviny-INFA



ЗА БЕЛАРУСКАЕ ПРЫХОДЗІЦЦА ЗМАГАЦЦА НА КОЖНЫМ КРОКУ … ЦІ Ж БЕЛАРУСКАЯ ГЭТА ДЗЯРЖАВА? ЦІ БЕЛАРУСКАЯ ЎЛАДА? ЦІ БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА? …


10.12.2007 Бацькі Янкі Лапіцкага, які навучаецца ў Гімназыі №1 Жодзіна па беларускамоўнай праграме, для таго, каб у школе быў праведзены хаця б адзін беларускамоўны сьвяточны ранішнік на Раство Хрыстова, вымушаны былі зноў пісьмова зьвяртацца да адміністрацыі школы.

І чарговы раз, пры падачы заявы ім прыйшлося адчуць безапэляцыйную адмову з вуснаў дырэктара Гімназыі №1 Каршуна Г.В.. Кіраўнік адукацыйнае ўстановы, якая зьмяніла свій беларускамоўны статус паведаміў, што школа не плянуе аніякіх беларускамоўных мерапрыемстваў і для дзяцей 5-х - 7-х клясаў будуць праведзены звычайныя дыскатэкі.



У выніку, на наступны дзень 11.12.07 бацькі Янкі Лапіцкага зьвярнуліся з заявамі адразу ў Жодзінскі Адзьдзел Адукацыі, Менскае Абласное Ўпраўленьне і Міністэрства Адукацыі РБ, дзе паставілі пытаньне перад кіраўніцтва гэтых установаў ппра факт дыскрымінацыі беларускамоўных дзяцей у Жодзінскай навучальнай установе, пра сыстэматычны характар парушэньня права на беларускамоўную адукацыю і канстатаванай роўнасьці дзяржаўных моваў, пра ігнараваньне





00027626

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
вул. Савецкая, 9
220010, г. Мінск
тэл. 227-47-36, факс 200-84-83
E-mail: root@minedu.unibel.by

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ул. Советская, 9
220010, г. Минск
тел. 227-47-36, факс 200-84-83
E-mail: root@minedu.unibel.by

20.12.2007 № 06-1914-Л-(0)-0

На № ________ от ________

Лапіцкай С.,
Лапіцкаму А.,
вул. 50 год Кастрычніку, 8-А, кв.30,
222160, г.Жодзіна,
Мінская вобл.

Аб разглядзе зварота

Паважаныя Святлана і Аляксей!

У Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны Ваш ліст ад 13.12.2007. Паведамляем наступнае.

Навагодняе свята для вучняў гімназіі № 1 г.Жодзіна Мінскай вобласці будзе праведзена на беларускай мове.

Дату правядзення і час вызначае агульнаадукацыйная ўстанова, куды вы можаце звярнуцца за дадатковай інфармацыяй.

Намеснік Міністра К.С.Фарыно

06Падліпская2226492
17.12.2007. Аб разглядзе звароту

Адказ на зварот бацькоў (Аляксею Лапіцкаму і Сьвятлане Лапіцкай) ад намесьніка Міністра Адукацыі РБ сп. Фарыно. Пасьля рашэньня Міністэрства адміністрацыя Гімназыі №1 прыняла станоўчае рашэньне па правядзеньні беларускамоўнага сьвяточнага мерапрыемства для вучняў.

палажэньняў Праграмы Мінадукацыі адносна распашырэньня беларускай мовы ў адукацыйных асяродках.

Праз тыдзень "адміністратыўная машына" выдала лёс беларускамоўных дзяцей у Жодзіне. Што вельмі паказальна, станоўчае рашэньне было першым прынятае ў Міністэрстве Адукацыі 20.12.2007г.. Паперу падпісаў намесьцнік Міністра К.С.Фарыно. І толькі пасьля гэтага, ужо маючы як бы "вышэйшы вэрдыкт" альбо "санкцыю на дазвол" у дачыненьні да масавага беларускамоўнага мерапрыемства, чыноўнікі Жодзінскай Гімназыі адважыліся прыняць станоўчае рашэньне (!?).

Так, 21.12.2007г. адказ дырэктара Гімназыі №1 Г.В.Каршуна быў перададзены праз Янку бацькам і фармальна трапіў заяўнікам "худчэй" адказу зь Мінадукацыі. У ім, на хуткую руку, пазначалася пра дазвол правесьці ў Гімназыі №1 беларускамоўны навагодні ранішнік.

Аўтар зьвярнуўся па камэнтар дадзенага рашэньня да бацькі Янкі Лапіцкага, Аляксея.

Аляксей Лапіцкі:
- Рашэньне прынята станоўчае, і гэта – канешне, добра. Аднак, чаму школа не прымае ініцыятыўных крокаў і, нават, спачатку заўсёды перашкаджае ў тым, што ёсьць ейным наўпросты абавязкам. Станоўчых зьменаў тут, здаровай тэндэнцыі – не праглядаецца. Чыноўнікі – нібы марыянэткі, спалоханыя і зьнямоглыя.

Прыходзіцца канстатаваць, што цяперашнія кіраўнікі навучальных установаў ня ўстане прымаць самастойных рашэньняў, асабліва калі яны тычацца любога беларускага пытаньня. Падаецца, што ўсё Беларускае негалосна разглядаецца (асабліва ў выхаваўча-адукацыйнай сфэры) як небясьпечнае ці нефармальна-апазыцыйнае ...

Глядзіце, у Міністэрстве заяву атрымалі 13.12.2007 і разглядалі ўчас візыту Пуціна ў Менск. Цяжка сказаць, што кіравала дзеяньнямі чыноўнікаў … З Жодзінскага ГАА і Менскага Ўпраўленьня адукацыі адказы дагэтуль не паступілі.

Алесь Вольны:
- Навогул, ствараецца ўражаньне, што начальства вагаецца і ня ведае "ў які бок нахіліцца", бо дагэтуль слаба ўяўляе, у якой дзяржаве працягваецца жыцьцё. Стан раздвоенасьці, які назіраецца ў былых прадстаўнікоў постсавецкае партыйнае намэнклатуры, што не могуць зразумець у якой краіне жывуць – ці ў былым саюзе, ці ў незалежнай Беларусі, ці ўжо ў Расейскай імпэрыі – нагадвае стан хворага ў палаце №6.



“Беларуская Елка 2007-08 У Жодзіне – адбудзецца 29 сьнежня а 12-30 у Гімназыі №1 ...” Уваход — свабодны! ;-)



Янка

Аляксей Лапіцкі:
- Сапраўды. Ідэалягічныя “хітрыкі” ў такіх умовах – “складаная” навука. Акрамя таго, не вядома, што заўтра будзе лічыць правільным “сам лекар”? Як правільна адказваць на пытаньні чарговага “тэсту”, каб цябе прызналі “сваім”, “правільна намэнклятурным” і ў той жа час “здаровым”?

І што будзе заўтра лічыцца ў прыярытэце новай адміністрацыі - толькі ёй самой і вядома? Проста катастрофа, а не жыцьцё для “жабракоў з начальства”!

Алесь Вольны:
- Так і жывем ...!?
І кожны дзень – як “бітва з дуракамі” зь песьні Андрэя Макарэвіча (“Машына Часу”).

ЦІ Ж БЕЛАРУСКАЯ ГЭТА ДЗЯРЖАВА?
ЦІ БЕЛАРУСКАЯ ЎЛАДА?!
ЦІ БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА?!! …


А як на гэтыя пытаньні адказаў бы “сам таварыш” … Лу-к …Пу-ц-ін!?

Дадаткі:
1) Заява ў Мінадукацыі РБ (ГАА, Менскае Ўпраўленьне Адукацыі);
3) Адказ з Мінадукацыі РБ ад 20.12.2007г.;
4) Адказ з Гімназыі №1 ад 21.12.2007г.

Алесь Вольны,
Жодзіна,
Licviny-INFA

Фота: Аляксея Лапіцкага

АДКАЗ ДЫРЭКТАРА ШКОЛЫ НА ЗВАРОТ БАЦЬКОЎ, ЗРОБЛЕНЫ ПАСЬЛЯ РАШЭНЬНЯ МІНАДУКАЦЫІ РБ !?



РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ
Министерство образования
Дзяржаўная установа адукацыі "Гімназія № 1" г.Жодзіна | Государственное учреждение образования "Гимназия № 1" г.Жодино
21 12 2007г.
№ 01-10/434
222160, г.Жодино, Минской области, ул. Гагарина, 32

Лапіцкаму А.І.

Лапіцкай С.П.

На Вашу заяву 10.12.2007 паведамляем, што навагодні ранішнік на беларускай мове для вучняў 5-7 класаў запланавана правесці ў гімназіі 29 снежня ў 12.30.

Чакаем прапаноў па дапамозе ў яго правядзенні.

Дырэктар
ДУА «Гімназія №1 г.Жодзіна» Г.В. Коршун

Незалежнае выданьне Жодзінскіх ініцыятываў “ЗА ЭЎРАПЕЙСКІ ГОРАД” і Цэнтру «Ліцьвіны»
Адрас рэдакцыі:
222160 Жодзіна, а/с 201.
E-mail: c_licviny@tut.by
Наклад 299 асобнікаў.
Рэдактар АЛЕСЬ ВОЛЬНЫ
Пры перадруку спасылка на выданьне і першакрыніцу абавязковая.